па светапоглядпай аснове фалькл. жанры не змаглі б замацавацца ў народзе). Распрацоўка ў А.л. менавіта праблем дабра і зла, маральна-этычнай праблематыкі з'явілася вынікам разумення ў народзе неабходнасці існавання агульнапрынятых норм грамадскага супольнага жыцця, але ўласцівыя легендам тэмы і ідэі ўсё ж сваім падмуркам маюць агульнатрадыцыйны нар. культурны фонд. Раскрытыя ў гэтых легендах праблемы маралі, дабра і зла, унутранага свету чалавека і яго ўзаемадачыненняў у супольнасці падаюцца праз прызму вандравання Бога і святых па зямлі, а гэта тыповы ход у асвятленні і вырашэнні пытанняў падобнага характару не толькі ў беларускім, але і ў традыцыйным фальклоры многіх іншых народаў. Да тыповых вобразаў А.л. — Бог, чалавек, святыя — арганічна далучаецца вобраз «вялікага грэшніка», які як сусветны архетып уласцівы традыцыйнай культуры амаль кожнага народа. Для бел. матэрыялу паказальны той факт, што ў шэрагу іншых тлумачэнняў сюжэт «вялікі грэшнік» атрымаў сваё вырашэнне і праз прызму сацыяльных адносін на ўзроўні грамадскіх дачыненняў. Пры ўмове дастаткова распрацаванай фабульнасці А.л. збліжаюцца з легендарнымі казкамі. Правесці мяжу паміж імі часам немагчыма, але калі браць пад увагу функцыянальнасць твораў згаданых жанраў, то размежаванне іх як праблема не ўяўляе неадольнай перашкоды.

*Літ.:* Романов Е. Белорусский сборник. Вып. 4. Витебск, 1891; Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 2. СПб., 1893; Легенды і паданні. Мн., 1983; Карскі Я. Беларусы. Мн., 2001; Беларуская вусна-паэтычная творчасць. Мн., 2000; Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Кн. 4. Народная проза. Мн., 2002; Federowski M. Lud białoruski. T. 1—2. Kraków, 1897—1902.

*А. В. Цітавец.*

**АПАНАС**, прысвятак *народнага календара*. Адзначаецца 18 і 31 студзеня. Лічыцца абаронцам жывёл ад марозу, а таксама «гусіным святам». Гаварылі, нібы апанасаўскія маразы здараліся такія моцныя, што ў «быка-трацьцяка» (трохгодка) зрывала рогі. Папярэджвалі: «Хавай нос у апанасаўскі мароз». У Смаленскай губерні існавала прыкмета: калі на А. бывае мяцеліца — чакаецца працяглая вясна і прыйдзецца нават «пунькі памясці». У Магілёўскай губерні гэты дзень азначаў палавіну зімы. Калі засталася палавіна корму для жывёлы, то казалі, што яна выжыве да вясны. У беларусаў Смаленшчыны зафіксаваны звычай карміць гусянят у абручыку. Там жа прасілі аб здароўі жывёлы: «Святы Уласій, Ахванасій, саблюдзі, Божа, красуль нашых». Заўважалі, калі на А. мяцеліца — многа выведзецца гусянят.

*Літ.:* Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мн., 2002.

*А. Ю. Лозка.*

**АПАНАСЕНКА** Аляксандр Рыгоравіч (23.11.1911, Кіеў — сакавік 2003), украінскі і бел. балетмайстар. Заслужаны артыст Украіны (1951). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1961). У 1919—27 вучыўся ў балетных студыях у Кіеве. З 1927 працаваў у розных музычных тэатрах і прафесійных танцавальных калектывах Украіны, у 1959—71 мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі. У сваёй творчай дзейнасці абапіраўся на фальклор; выкарыстоўваў канкрэтныя ўзоры нар. танцавальнай творчасці і асобныя фалькл. элементы, сюжэты і матывы. Стварыў шэраг сцэнічных варыянтаў традыцыйных бел. танцаў: «Бычкі», «Лявоніха» і інш. Жартоўны танец «Бычкі» створаны па

*Сюіта «Мяцеліца» ў пастаноўцы А. Р.* ***Апанасенкі.***



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матывах старадаўняга танца і нар. гульні ў «верхавога», «Беларуская рапсодыя» — па матывах свята Купалля. Элементы бел. нар. танцавальнай творчасці склалі аснову пластычнай тканіны многіх сцэн аднаактовага харэаграфічнага спектакля «Беларуская партызанская» на музыку Я.Глебава. Сярод значных пастановак: «Мяцеліца», «Беларуская сюіта», «Маладзёжная сюіта». Галоўны мастацкі прынцып пры стварэнні нумароў на аснове нац. фальклору — яркая тэатралізацыя, што адлюстравалася ў форме падачы і арганізацыі пластычнага матэрыялу (выкарыстанне складанай трукавай тэхнікі, апора ў танцавальнай лексіцы на базу класічнага танца, увядзенне пантамімных эпізодаў, адбор выразных сродкаў, выпрацаваных тэатрам, і інш.) і ў імкненні да сюжэтнай драматургіі з яркімі персанажамі і вобразамі (Чорт, Мядзведзь, Мужык, пераапрануты Бабай, — у «Мяцеліцы», Пастушок і хлопцы, якія стваралі вобразы маладых бычкоў, — у «Бычках» і інш.).

*Літ.:* Ч у р к о Ю.М. Белорусский сценический танец. Мн., 1969. С. 86—94.

*С. В. Гуткоўская.*

**АПАТРАПЕ́Й**, гл. *Абярэгі.*

**АПАТРАПЕ́ЙНАЯ МА́ГІЯ**, гл. ў артыкуле *Ахоўная магія.*

**АПІВА́ЛА**, персанаж *чарадзейных казак* сюжэтнага тыпу СУС 513 А, які выступае ў ролі дзівоснага памочніка. Як і *Аб'ядала*, А. памагае герою (Івану Сучкінаму сыну, Іскарку-парубку, Таратурку) вытрымаць цяжкае выпрабаванне — выпіць вялізную колькасць вады, піва і высватаць царскую дачку. У некаторых казках («Іскарка-парубак Дзевічы сын», «Таратурка») функцыі А. і Аб'ядалы выконвае адзін персанаж. Незвычайныя здольнасці А. ў казках пададзены вельмі маляўніча: А. сядзіць на рацэ, яму «ў рот вада бяжыць, а з яго нідзе не відаць — ніжы яго рака суха».

*Літ.:* Гл. да арт. *Аб'ядала.*

*К. П. Кабашнікаў.*

**АПІВЕ́НЬ**, персанаж народных павер'яў; нячысцік, які чапляецца да людзей, схіляючы іх да п'янства. Прысутнічае на ўсіх застоллях, сочачы, хто колькі выпівае. Падбухторвае не надта пітушчых выпіць паболей. Калі гэта яму не ўдаецца, падсыпае ім у чарку нейкага зелля, пасля чаго чалавек робіцца зусім п'яны. Любіць забаўляцца з п'яніцамі, дражнячы іх і скідваючы пад стол. Пабачыць А. можна толькі на добрым падпітку. Яго знешнасць спалучае ў сабе антрапа- і зааморфныя рысы. Ён уяўляецца невялічкай істотаю, парослай цёмнай рэдкай поўсцю. Галава па форме нагадвае чалавечую, толькі са свіным рылам, а там, дзе павінны быць бровы, — тырчаць маленькія, як у маладога бычка, рожкі. Ёсць у А. хвосцік, закручаны, нібы ў парсючка, ножкі з капыткамі. Ходзіць прама альбо ракам. Сцвярджаюць, што няма на свеце п'яніцы, які здолеў бы перапіць А. Сам жа нячысцік, колькі б ні піў, надта п'яным не будзе. Пра чалавека, які шмат п'е, але не п'янее, гавораць, што ён п'е, як А. Гэты персанаж згадваецца ў Мядзельскім раёне.

*Літ.:* Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 458.

*У. А. Васілевіч.*

**«АПО́ВЕСЦЬ МІНУ́ЛЫХ ГАДО́Ў»**, найстаражытны ўсходнеславянскі летапіс. Складзены каля 1113 кіева-пячорскім манахам Нестарам на аснове папярэдніх летапісных зводаў, якія не захаваліся. Можа разглядацца як адна з важнейшых крыніц па ўсходнеславянскім фальклоры даўняй пары і міфалогіі. Дайшла ў 2 рэдакцыях — Лаўрэнцьеўскай (1116, спіс 14 ст.) і Іпацьеўскай (1118, спіс 15 ст.). Тэкст складаецца з 2 асноўных частак: недатаванай (да 852) і датаванай (да 1110). Аўтар імкнуўся меркаваць пра навакольны свет з пункту гледжання адзінага сэнсу і канчатковай мэты чалавечага існавання, што цалкам абумоўлівалася яго хрысціянскім светапоглядам. Твор пачынаецца з апавядання пра падзел зямлі паміж сынамі Ноя. Даецца пазычаны з візантыйскіх крыніц пералік народаў свету, сярод якіх названы і славяне. Пасля падаецца гісторыя ўсходніх славян. Па змесце помнік вельмі складаны. Уключае кароткія пагадовыя запісы і гістарычныя апавяданні, тэксты дзелавых дакументаў, багаслоўскі трактат, пазычаную з ранейшых летапісаў аповесць пра хрышчэнне Русі, вытрымкі з перакладных твораў і інш. Гістарычны працэс пад пяром Нестара прадстае як паслядоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ